Л.Г. Бараноўская
*(Магілёў)*

## Мастацкая анімалістыка ў школьным вывучэнні

Мастацкая анімалістыка – адно з цікавых і малавывучаных пытанняў у сучасным літаратуразнаўстве. У школьную праграму ўключана вялікае кола мастацкіх твораў на анімалістычную тэму. Дарэчы, гэта тэма мае даволі багатую гісторыю. Карані яе ўзыходзяць да фальклорных твораў, дзе занатаваліся шматвекавыя традыцыі, якія адлюстроўваюць як паганскае светаўяўленне людзей, так і хрысціянскія ўплывы на свядомасць чалавека.

Так, ва ўсіх індаеўрапейскіх народаў мы знаходзім міфічныя персаналіі з'яў прыроды ў вобразах розных птушак і звяроў. Даследаванню спадчыны славян прысвяцілі свае працы А.Н. Афанасьеў, Б.А. Рыбакоў і іншыя. Аналізуючы іх працы, прыходзім да высновы, што ў фальклоры, моўныя адзінкі, сімволіка з'яўляюцца тымі вытокамі, якія дазваляюць рэканструяваць сувязь жывёл з міфалагічным

пачаткам. Яшчэ ў дабіблейскія часы чалавек асэнсоўваў сябе і сусвет праз прызму жывёльнага свету. Сведчаннем таму стала шырокае выкарыстанне зааморфных вобразаў у сферы сімволікі, эмблематыкі, геральдыкі (успомнім назвы некаторых хвароб – рак, жаба і інш.; будаўнічых і іншых канструкцый, а таксама ў выхаванні дзяцей: казкі пра жывёл, гульні, ласкавыя словы, цацкі ў выглядзе жывёл і г. д.).

Сярод твораў школьнай праграмы даволі цікавымі з'яўляюцца прыведзеныя для вывучэння ў 5 і 8 класах мастацкія тэксты, якія ўключаюць анімалістычныя вобразы са славянскай міфалогіі ("Ваўкалакі", 5 клас). Дарэчы, для падачы гэтага матэрыялу мэтазгодна праглядзець работы А. Сержпутоўскага, У. Васілевіча, даследаванні А. Чароты.

Наступным этапам вывучэння анімалістычнай тэмы павінна стаць асвятленне пераходу міфалагічных вобразаў у павер'і, паданні, легенды, казкі, літаратурныя творы. Для гэтага школьнай праграмай прапанаваны шэраг фальклорных твораў, якія ўключаюць у сябе анімалістычныя вобразы: казкі "Лёгкі хлеб", "Залаты птах", прыказкі, прымаўкі, песні "Жаваранкі прыляцелі...", "Зязюля кукуе, лецечка чуе" і інш.

Еднасць чалавека і прыроды ў фальклорных творах рэхам адгукнулася ў літаратуры. Шматлікія анімалістычныя вобразы-сімвалы сустракаюцца ў "Слове пра паход Ігаравы", што прапанавана для вывучэння ў X класе.

Яшчэ адным з помнікаў старажытнай літаратуры, дзе анімалістычныя матывы звязаны з пейзажам, побытам людзей, з'яўляецца "Песня пра зубра" М. Гусоўскага. У паэме даецца апісанне зубра на высокім мастацкім узроўні:

Водзіцца зубр у дрымучых лясах на землях літоўскіх,
Ён грамадны і ў рост, і ўпярочкі, і ўздоўж.
Так што, калі сканае ад ран, упурыўшы голаў,
Сядуць да трох малайцоў купай адной між рагоў.

*("Песня пра зубра".)*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Акрамя таго, вобраз зубра выступае сімвалам Беларусі, яе адраджэнскай моцы.

Што датычыцца разгляду анімалістычнай тэмы ў кантэксце рамантычнага напрамку, то тут таксама адчуваецца сувязь з фальклорнымі міфалагічнымі традыцыямі. З прапанаваных праграмай твораў гэтага перыяду выдзяляецца зборнік Я. Баршчэўскага "Шляхціц Завальня" (8 клас). У ім апавяданні "Ваўкалак", "Вужыная карона" зноў вяртаюць да раней разгледжаных тэкстаў-паданняў пра ваўкалака, што дазваляе вывучаць мастацкія творы ў школе па сістэме перспектыўных ліній.

Паглыбленае даследаванне ўзаемаадносін чалавека з грамадствам і прыродай абумовіла новыя тэндэнцыі ў развіцці анімалістычнай тэмы ў беларускай літаратуры XIX – пачатку XX стст. У гэты перыяд да яе звярталіся такія класікі беларускай літаратуры, як Ф. Багушэвіч, М. Багдановіч, Я. Купала, Цётка, Я. Колас і інш. У школьную праграму ўключаны паэма "Кепска будзе!" Ф. Багушэвіча, апавяданне "Міхаська" Цёткі, верш "Пагоня" М. Багдановіча і інш.

Што датычыцца літаратуры 20–50-х гг. XX ст., то яркім узорам твора мастацкай анімалістыкі з'яўляецца зборнік апавяданняў Я. Коласа "Казкі жыцця" (9 клас), дзе назіраецца шырокае ўжыванне анімалістычных вобразаў-сімвалаў, вобразаў-алегорый чалавечых характараў, сацыяльных праблем грамадства.

Адным з цікавых аспектаў беларускай літаратуры XX ст. з'яўляецца росквіт такога жанру, як байка. Выдатным узорам яе служаць байкі К. Крапівы, некаторыя з якіх прапанаваны для вывучэння як у сярэдніх, так і ў старэйшых класах: "Ганарысты Парсюк", "Дыпламаваны Баран", "Саманадзейны Конь", "Каршун і Цецярук".

Трэба таксама адзначыць, што анімалістычная тэма стаіць у беларускай літаратуры XX ст. побач з экалагічнай, а ў 80–90-х гг. – з постчарнобыльскай. У праграмах па беларускай літаратуры творы на анімалістычную тэматыку ў асноўным прапанаваны для вывучэння ў сярэдніх класах. Гэта і "Былі ў мяне мядзведзі" У. Караткевіча, "Алені" І. Пташнікава (5 клас), "Дыялог з мурашом" Г. Бураўкіна (6 клас), "Губаты" Г. Далідовіча (7 клас) і іншыя.

Большасць твораў на анімалістычную тэму закранаюць прабле-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

му ўзаемаадносін чалавека і прыроды. У апавяданнях І. Пташнікава "Алені", "Былі ў мяне мядзведзі" У. Караткевіча малюецца амаль падобная сітуацыя: прыручаныя чалавекам звяры гінуць, калі трапляюць на свабоду. У. Караткевіч выступае як пісьменнік-гуманіст, для якога свет жывой прыроды – гэта свет унікальны і варты чалавечай любові, спагады, шанавання. З любасцю і замілаваннем апісвае аўтар маленькага Бурыка: "Шчанюк быў велічынёю з рукавічку, маленькі-маленькі, светлы. І вочкі былі ці то сінія, ці то з блакітнай каламуццю, як то бывае ў шчанюкоў. А дурныя, дурныя!"[1]. Апісанне жыцця мядзведзя ў людзей прасякнута добрым гумарам. Здаецца тое ж чакае жывёлу і на волі. Далейшы лёс Бурыка застаўся невядомым. Толькі адзін раз сустрэўся з ім галоўны герой апавядання і то засумняваўся, ці сапраўды гэта быў яго Бурык. Іншая сітуацыя склалася з другім мядзведзем Тупам, які таксама быў адпушчаны ў лес. Апавяданне мае трагічны фінал, бо жывёла была застрэлена людзьмі, якія палічылі яго небяспечным. Спачатку прыручыць, а потым адпусціць на волю – такі ўчынак чалавека аўтар называе здрадай: "Паляванне толькі тады паляванне, калі яно адзінаборства. То што ўжо казаць пра звяроў, якіх мы кідаем у рабства, прывучаем любоўю, а тады забіваем толькі за тое, што яны любяць нас і шукаюць нас.

Было гэта так, як быццам я сам адвёў сябра ў камеру смяротнікаў"[2]. Спасцігаючы свет жывёл, спрабуючы зразумець іх, У. Караткевіч у сваім творы адступае ад хрысціянскіх пазіцый, сцвярджаючы роўнасць усяго жывога на зямлі. Сведчаннем таму выступаюць наступныя біблейскія радкі: "І сказаў Бог: створым чалавека па вобразу Нашаму; і да ўладараць ён над рыбамі марскімі, і над птушкамі нябеснымі, і над скацінай, і над усёй зямлёю, і над усімі гадамі, паўзунамі на зямлі"[3]. Стаўленне У. Караткевіча да фауны раскрывае глыбока духоўны змест яго пісьменніцкай творчасці, дапамагае ад-

---

[1] Караткевіч У. Збор твораў: У 8 т. – Т. 2. – Мн., 1988. – С. 406.

[2] Тамсама. – С. 425.

[3] Библия. Книги Священного Писания: Ветхого и Нового завета. – Chicago, USA, 1990. – С. 1.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чуць маральныя перакананні і прыярытэты чалавека сучаснага экалагічнага мыслення.

Гэтай пазіцыі прытрымліваецца і І. Пташнікаў. У апавяданні "Алені" аўтарскія адносіны да прыроды прасякнуты шчымліва-мінорнай ноткай спачування, трывогай пра яе будучыню. Такі ж матыў адчуваецца і ў апавяданні У. Караткевіча "Былі ў мяне мядзведзі". Амаль звычайная гісторыя пакладзена ў аснову апавядання "Алені": у галодныя пасляваенныя гады ляснік са сваім знаёмым забіваюць аленя для таго, каб накарміць сям'ю. Маленькая дачушка ляснічага Ірка сябравала з Рагатым (тым аленем, якога забілі). І. Пташнікаў спрабуе зазірнуць у душу як чалавека, так і жывёлы, паказвае іх узаемаадносіны.

Аўтар малюе традыцыйны паводле славянскіх уяўленняў вобраз аленя, які абагаўляўся ў дабіблейскія часы. Паляванне на яго было галоўным промыслам – адсюль бярэ вытокі культ аленя. Гэты матыў прысутнічае на галаўных уборах шаманаў, што сведчыць аб мудрасці жывёлы ва ўяўленнях язычнікаў. Яго розум, высакароднасць прадэманстраваны і ў гэтым творы. Калі дзяўчынка працягнула аленю кавалачак хлеба, то Рагаты не ўзяў яго. Ён толькі лізнуў языком руку, як быццам сапраўды ведаў, што адбірае ў дзіцяці адзіны ласунак. Але ж аленя забівае бацька, каб накарміць яе, Ірку. Карыслівасць, жорсткасць людзей і добразычлівасць звера супрацьстаяць адзін аднаму. Драматызм і напружанасць сюжэта скіраваны на асвятленне гэтага кантрасту.

Даследчык літаратуры М. Эпштэйн піша: "Анімалізм як творча адказныя адносіны чалавека да жывёльнага свету – адзін з важнейшых сродкаў пашырэння сучаснага гуманізму, які выходзіць з наіўнай сваёй стадыі "абагаўлення" чалавека – да сталага супрацоўніцтва і ўзасмадзеяння з усімі формамі жыцця на зямлі"[1].

У сваіх творах, дзе шырока выкарыстоўвацца анімалізм, І. Пташнікаў кожны раз акцэнтуе ўвагу на тым, што гінуць жывёлы

[1] Эпштейн Н. Мир животных и самопознание человека // Художественное творчество: Вопросы комплексного изучения. Человек – природа – искусство. – Л.: Наука, 1986. – С. 87.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

не самі па сабе, а па віне чалавека. Гэта і браканьерства ("Алені"), і вынікі чарнобыльскай катастрофы ("Львы"), і проста безадказнасць, нежаданне прытрымлівацца прынцыпаў гуманізму, маральнасці ў паводзінах, той пазіцыі, пра якую гаворыць Маленькі прынц з вядомай казкі А. дэ Сент-Экзюперы: "Мы заўсёды ў адказе за тых, каго мы прыручылі" ("Арчыбал" і інш.).

Трагічны фінал і ў "Пагоні" І. Пташнікава. Празаік працягвае сусветна вядомы сюжэт рабінзанады – барацьба за выжыванне. Гэта закон, які пануе ў жывёльным свеце і які дзейнічае і ў свеце людзей, што і паказвае аўтар апавядання. Мастацкі свет пташнікаўскіх твораў, які "насяляюць" жывёлы, не зусім адназначны. Калі ў "Аленях" і "Львах" звяры існуюць як рэаліі прыроды, то ў такім апавяданні, як "Пагоня", анімалістычныя вобразы набываюць сацыяльныя значнасці характару. І часам цяжка сказаць: чалавек перад намі ці жывёла? У гэтым праяўляецца язычніцкае (паганскае) уяўленне чалавека пра мадэль жыцця грамадства, прыроды ў цэлым. У "Пагоні" вобразы жывёл акрамя таго, што ўспрымаюцца як рэальныя істоты, маюць алегарычны характар. Жорсткія законы, па якіх жывуць звяры дзеля таго, каб выжыць, нагадваюць законы ўладкавання сучаснага грамадства. Вось як адгукнуўся на "Пагоню" У. Мехаў: "Апавяданне, зразумела, не пра жывёльны свет, хоць дзейныя асобы ў ім лось і ваўкі (можна чатырохногіх называць асобамі?). Яно пра нас, пра людзей. Звярыная грызня на выспе, дзе ваўкі зжэрлі лася і ў нясцерпным усё-такі голадзе накінуліся адно на аднаго, – алегарычнае адлюстраванне таго, што адбываецца вякі і вякі між людзей"[1].

Парадак уладкавання грамадства, узаемаадносіны людзей паміж сабой, уздзеянне чалавека на акаляючае асяроддзе... Гэтыя пытанні вучні пачынаюць па-сапраўднаму асэнсоўваць у старэйшых класах, найперш тады, калі вывучаецца прадмет "Чалавек і грамадства". Хацелася б параіць укладальнікам праграм па літаратуры ўвесці для вывучэння апавяданне "Пагоня" І. Пташнікава ў старэйшых класах, дзе бракуе твораў на анімалістычную тэму.

Мастацкая анімалістыка з'яўляецца наватарскай для беларускай

---

[1] Мехаў У. Нельга не парадавацца // ЛіМ. – 1999. – 20 жніўня. – С. 4.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

літаратуры. Яе вывучэнне – адзін з цікавых аспектаў, які заслугоўвае ўвагі таму, што ў сучаснай школе вельмі важна сфарміраваць гуманістычную і экалагічную свядомасць асобы.